Весткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

Viestki j Paviedamleńni

Сусьветнае сеціва: *e-krama.com, pahonia.com*
Электронны адрас: *viestki@mail.com*
✉ *P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735*

№ 10 (596)
Кастрычнік 2015 г.

Прээнтацыя і сьвяткаваньне ў Брукліне

У нядзелю 24 жніўня ў грамадзкай залі пры саборы сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне адбылося сьвяткаваньне Дня аднаўленьня дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі і прээнтацыя двух кнігаў.

Імпрэзу адкрыла кароткім словам, прывітаўшы прысутных, старшыня Бруклінскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня (БАЗА) Тацяна Красоўская. Яна нагадала, што 25 жніўня 1991 году, калі сэсія Вярхоўнага Савету Беларусі надала Дэклярацыі аб Суверэнітэце Беларусі статус канстытуцыйнага закону, юрыдычна адбылося аднаўленьне незалежнасьці Беларусі, што мы і сьвяткуем цяпер.

Затым з прывітаньнем выступіла старшыня Галоўнай Управы БАЗА Ганна Сурмач. Яна падкрэсьліла важнасьць адзначаемай падзеі і спынілася на ролі БАЗА ў захаваньні беларускай прысутнасьці ў Амэрыцы і дапамозе Бацькаўшчыне.

Са словамі прывітаньня да прысутных таксама зьвярнуліся Старшыня Беларускага Народнага Фронту і Партыі БНФ Зянон Пазьняк і Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонка Сурвілла. Сп-ня Галіна Вашчанка прыгожа прачытала некалькі вершаў слаўнай паэткі Ларысы Геніюш.

Сяргей Навумчык прадставіў свае тры кнігі, сярод якіх “1995-ты”, прысьвечаную падзеям 20-гадовай даўніны, што сталі вырашальнымі для лёсу Беларусі. Сп. Навумчык спыніўся таксама на падзеях жніўня 1991 году, калі ў выніку спробы дзяржаўнага перавароту і стварэньня камітэту змоўшчыкаў ГКЧП быў арыштаваны Гарбачоў, паўстала пагроза вяртаньня да савецкіх таталітарных часоў. Беларускі Народны Фронт, ягоныя прадстаўнікі й прыхільнікі ў Вярхоўным Савеце Беларусі выступілі ў абарону сувэрэнітэту. Яны ўрэшце змусілі камуністычную намэнклятуру ў складзе дэпутатаў ВС пагадзіцца на адмежаваньне ад Расеі, наданьне канстытуцыйнай сілы прынятаму годам раней закону аб сувэрэнітэце Беларусі.

Прамоўца таксама спыніўся на кар’еры Лукашэнкі ў тыя часы, на ягоных паездках у Маскву. Ён таксама закрануў прэзыдэнцкія выбары 1994 году і міт пра тое, што “на чэсных выбарах Лукашэнка перамог Кебіча”. Масква даўно паставіла на Лукашэнку, і Шушкевіч, ведаючы ці ня ведаючы аб гэтым, спрычыніўся да ягонага ўзьлёту і свайго заняпаду, прызначыўшы таго старшынём антыкарупцыйнай камісіі.

заканчэньне на бачынах 2,3

Верасьнёўскі сход Згуртаваньня “Пагоня”

19 верасьня, у Цэнтральным парку на Мангэтане ў маляўнічай мясьціне недалёка Бэтэсда-фантану каля возера на гары каля хвоек, што нечым нагадваюць Беларусь, прайшоў чарговы сход Згуртаваньня “Пагоня”. Напачатку старшыня Згуртаваньня сп. Віталь Зайка распавёў пра мэты і прынцыпы арганізацыі, пра яе дзейнасьць. Ён падрабязьней спыніўся на задачах юрыдычнай, інфармацыйнай і адукацыйнай дапамогі для прыяжджаючых зь Беларусі ў ЗША людзей, пра патрэбы каардынацыі і салідарнасьці.

Сп. Зайка паведаміў пра маючыя адбыцца 27 верасьня акцыі пратэсту супраць дыктатуры Лукашэнкі й захопніцкай палітыкі Пуціна ў сувязі з пачаткам Генэральнай асамблеі ААН, на якую плянуюць прыехаць абодва дыктатары. Прамоўца заклікаў рыхтаваць плякаты і лёзунгі і падтрымаць акцыі каля штаб-кватэры ААН і прадстаўніцтве Беларусі ў ААН.

Затым перад прысутнымі выступіў сп. Дзьмітры Шчыгельскі, кіраўнік арганізацыі “Беларусы ў Экзылі”, які, як лекар-псыхіятар, езьдзіў на Данбас у зону баявых дзеяньняў на ўсходзе Ўкраіны, каб дапамагчы вайскоўцам узброеных сілаў Украіны арганізаваць дапамогу па псыхіятрычным профілі, ствараць мабільны шпіталь імя Пірагова, што цалкам забясьпечаны спэцыялістамі-добраахвотнікамі. Сп. Шчыгельскі адзначыў, што ва Ўкраіне, якая фактычна сам-насам змагаецца супраць расейскай агрэсіі, неабходная дапамога, і беларусы мусяць яе прапанаваць, бо яны цалкам рэальна могуць стаць наступнымі ахвярамі агрэсіі. Самая эфэктыўная дапамога – удзел ва ўзброеным змаганьні, або, калі на гэта людзі ня могуць наважыцца, дапамога матэрыяльная, фінансавая, збор сродкаў, мэтавае купляньне абсталяваньня, лекаў, іншых матэрыялаў.

Напрыканцы сходу адбыліся знаёмствы, людзі мелі нагоду пазнаёміцца зь землякамі, пагутарыць, абмяняцца каардынатамі, даведацца наконт мажлівасьцяў па пошуку жытла, працы, варыянтаў працягу вучобы і г.д.

Надвор’е спрыяла сходу, і колькасьць прысутных была ўражваючай.

Віталь ЗАЙКА

Прээнтацыя кніг і сьвяткаваньне

працяг з бачыны 1

Затым, перайшоўшы да падзеяў вызначальнага 1995 году, сп. Навумчык спыніўся на ролі пост-камуністычнай прапаганды і былой камуністычнай намэнклятуры, што ўспрымалі незалежнасьць Беларусі злом, а нацыянальна-дэмакратычныя сілы – фашыстамі і “агентамі Захаду”. БНФ зрабіў усё, каб замацаваць сувэрэнітэт і незалежнасьць, хоць Лукашэнка гандляваў імі, спадзеючыся захапіць кіраваньне ў Маскве, бачачы ўсё менш адэкватныя паводзіны Ельцына. Менавіта БНФ разам з усім народам належыць гонар аднаўленьня незалежнасьці і, не ў малой ступені, яе захаваньне.

На здымку зьлева направа: Галіна Вашчанка, Сяргей Навумчык, Вітаўт Кіпель, Івонка Сурвілла, Зянон Пазьняк.

Сп. Вітаўт Кіпель, дырэктар Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва, выступіў з прэзэнтацыяй сваёй кнігі “Жыць і дзеіць: успаміны”. Гэта кніга ўспамінаў, што стала вынікам запісаў на аўдыё, якія зрабіў і запісаў сп. Сяргей Шупа, які стаў таксама рэдактарам кнігі. Прадмову да яе напісаў сп. Янка Запруднік.

Сп. Кіпель распавёў пра сваіх бацькоў, часы дзяцінства ў Менску і Вятцы. Бацька сп. Вітаўта, Яўхім Кіпель, што працаваў у Інбелкульце і сыстэме адукацыі, быў арыштаваны як “нацдэм” у 1930 годзе. Пасьля яго выслалі ў Налінск, каля горада Вяткі, і маці зь Вітаўтам перабраліся да яго. Маці тады пастанавіла, што мовай у сям’і будзе толькі беларуская, а парасейску можна толькі па-за хатай. Бацьку потым перавялі ў Вятку. Калі сям’я пераехала на пасяленьне ў Арол, бацьку неўзабаве зноў арыштавалі. Перад самай вайной бацьку вызвалілі, але не дазволілі жыць зь сям’ёй, накіравалі пад Бранск.

заканчэньне на бачыне 3

Міграцыйнае вар'яцтва, або уцекачы, ад якіх уцякаюць гаспадары

У сувязі з заявамі адміністрацыі Абамы пра тое, што ЗША прымуць у сябе каля 100 тысяч уцекачоў у 2016 годзе, і параўнальную іх колькасьць у 2017 і ў наступныя гады, напрошваецца пытаньне, наколькі гэты жэст дабрачыннасьці апраўданы і мае сэнс з пункту гледжаньня дзяржаўных інтарэсаў Злучаных Штатаў. Прычым інтарэсаў менавіта ўсёй краіны, а не паліткарэктных левакоў, якія цяпер кантралююць пытаньні зьнешняй і ўнутранай палітыкі. Вядома, як востра стаіць у нашыя часы пытаньне ісламскага тэрарызму. Вядома таксама, што апошні скачок у напрыве імігрантаў ёсьць беспрэцэдэнтны, але выкліканы ён ня толькі і ня столькі вайною ў Сірыі, бо ўцекачы адтуль складаюць усяго каля 20% мігрантаў. Уражвае каардынацыя і арганізаванасьць мігрантаў, тысячы якіх рухаюцца праз Паўднёва-Усходнюю Эўропу як добра зарганізаванае войска. Абраныя канкрэтныя маршруты, вядомыя этапы пераходаў – там пешшу, тут аўтобусамі, там чыгункаю. Як і належыць войску, пераважную большасьць яго складаюць маладыя хлопцы 20-25 год, і толькі нібы для плезіру, ці хутчэй для карцінак у паведамленьнях навінаў, сям-там трапляюцца кабеты, пераважна маладыя, і дзеці.

Нехта мусіў прадумаць маршрут, пралічыць адцінкі й мажлівасьці перасадкі, абраць час – цёплы пэрыяд, калі начаваць можна і на прыродзе. І – даць сыгнал, прывёўшы ў рух дзясяткі й сотні тысяч людзей. Мігранты перамяшчаюцца арганізавана, і арганізавана выступаюць з дэманстрацыямі пратэсту, калі іхны рух па нейкіх прычынах запавольваецца мясцовымі ўладамі. Апранутыя мігранты, дарэчы, вельмі шыкоўна і, бадай, нятанна – па апошніх эўрапэйскіх модах. Сярод іх зусім няма фэлахаў у зашмальцаваных нацыянальных строях. Гэта нагадвае рух упэўненых у сабе людзей, што ідуць браць сваё, а зусім ня бедных небаракаў, што ўцяклі з хаты ў чым стаялі, ратуючыся ад перасьледу, а цяпер аддаюць сябе на міласьць гаспадароў.

На месцы гаспадароў-эўрапейцаў варта было б зьвярнуць увагу на ўсе гэтыя дэталі, спытаць сябе – "чаму гэтулькі?", "чаму цяпер?". Ці не таму, што Ісламская Дзяржава яшчэ ў лютым месяцы прыгразіла накіраваць у Эўропу паўмільёна мігрантаў, сярод якіх будуць "іхныя людзі"? І сапраўды, як адрозьніць сярэднестатыстычнага мігранта, маладога хлопца ў добрай фізычнай форме з плецаком і ў джынсах, ад джыхадыста, тым больш што спраўджаць дакумэнты будзе позна, дый каму? Колькі б фахоўцаў зь ведаю арабшчыны ня мела нават слаўная традыцыямі арабістыкі Нямеччына, але й іх ня хопіць на ўсе выпадкі. Што тут казаць пра Амэрыку.

Але справа нават ня толькі ў засланых арабскіх "шчірліцах". Ужо пры дасюлешняй, паступовай іміграцыі ў краінах Захаду паўстала пакаленьне расчараваных, спаняверaных маладзёнаў, якое пераносіць адказнасьць за свае фрустрацыі й неадаптаванасьць на грамадзтвы, што прытулілі іх або іхных бацькоў. Таму з пэўнасьцю можна сказаць, што сярод тых соцень тысяч уцекачоў, якіх зьбіраецца завезьці Абама, будзе пэўная доля расчараваных. А пэўны працэнт тае долі актыўна возьмецца за "помшчаньне" сваіх фрустрацыяў. Колькі іх будзе, колькі ад іх загіне – ня ведае ніхто, але нельга закрываць вочы на той факт, што яны будуць. І, нажаль, іхнымі ахвярамі стануць не адстаўны ўжо прэзыдэнт Абама, якога ад сьмерці захавае ўзброеная ахова, і не дзяржсакратар Кэры, а простыя амэрыканцы, можа гэткія самыя імігранты, як і ўпушчаныя "ўцекачы". Гэта стане сапраўдным іспытам Амэрыкі, прыцягальнасьці яе сыстэмы й прынцыпаў. І Амэрыка, мажліва, выстаіць. Але вось шмат гаспадароў-амэрыканцаў будуць змушаныя кідаць дамы, шукаць ратунку ад чаканых і нечаканых суседзяў, уцякаць, як уцякаюць цяпер жыхары Мэйну і Мінэсоты, што прынялі "дэсанты", прысланыя дзярждэпарамэнтам. Старая амэрыканская показка гаворыць, што дабрачыннасьць пачынаецца ў сваёй хаце. Чаму б пра гэта ня ўспомніць сёнешнім кіраўнікам Амэрыкі.

Віталь ЗАЙКА

Прэзэнтацыя і сьвяткаваньне

заканчэньне з бачыны 1

Калі немцы занялі Арол, сям'я злучылася, і пад выглядам бежанцаў вярнуліся ў Беларусь.

У кнізе падрабязна апісаны Менск часоў вайны й акупацыі, вучоба ў беларускай школе. Затым былі выезд у Нямеччыну, лягеры ДП і вучоба ў Беларускай гімназіі імя Янкі Купалы ў Рэгенсбургу, скаўтынг. Потым – геалягічны факультэт Лювэнскага ўнівэрсытэту, шлюб з Зорай Савёнак, пераезд у Амэрыку, грамадзкая дзейнасьць, праца ў БІНіМе, у Нью-Ёрскай публічнай бібліятэцы. Актыўны ўдзел у жыцьці беларускай грамады ў ЗША і працы па яе гісторыі. Сп. Кіпель падчас свайго выступу прыводзіў шмат цікавых фактаў і вінетак з мінулых часоў, са свайго досьведу працы й грамадзкай дзейнасьці, што з жывой цікавасьцю былі сустрэтыя прысутнымі.

Затым пра сваю працу з успамінамі Вітаўта Кіпеля распавёў рэдактар кнігі, супрацоўнік "Радыё Свабода" ў Празе сп. Сяргей Шупа. Успамінамі пра супольныя часы ў гімназіі Янкі Купалы і пра ўдзел у беларускім скаўтынгу разам з В. Кіпелем, пра Лювэн – падзяўся сп. Вячка Станкевіч. Сп-ня Ганна Сурмач прыгадала сваю першую сустрэчу са сп. Вітаўтам Кіпелем падчас ягонага з жонкаю прыезду ў Менск напачатку 1990-х гадоў.

Прысутныя мелі нагоду задаць пытаньні аўтарам прэзэнтаваных кнігаў, набыць выданьні і атрымаць аўтографы ад аўтараў.

Віталь ЗАЙКА

“Галгатня пра ЗыШыА”

Сьвята кожны дзень

Амэрыканскі каляндар зусім не такі як беларускі. Колькасьць дзён хіба што тая ж, а так – усё інакшае. У Беларусі ён шурпаценькі, адрыўны, з паверʼямі, у Амэрыцы – глямурны, плякатны або перакідны, з брэндамі, лягатыпамі ці то зь якімі-небудзь голымі дзеўкамі. У прынцыпе, усё зь пераліčанага ўжо дабраліся і да Беларусі, і добра што свой адрыўны каляндар беларусы не аддалі. У ім у кожную пару году па вялікім сьвяце. А ў амэрыканцаў заканчваецца адно, за ноч мяняюцца вітрыны крамаў, і пачынаецца падрыхтоўка да наступнага. У Беларусі Дзяды, восеньскія і веснавыя, у іх цалкам для Беларусі чужародны, а па сваёй сутнасьці полюсна працілеглы, Гэлаўін. Толькі ў Беларусі самыя доўгія Каляды на сьвеце, перш каталіцкія, пасьля праваслаўныя. Затое ў амэрыканцаў

самы працяглы калядны распродаж, які пачынаецца адразу пасьля Гэлаўіна і за два месяцы стамляе сваёй каляднай “атмасфэрай” так, што сьвяты пасьпяваюць абрыднуць. Затым Сьвяты Валянтын, які, як па мне, можна было б пасьпяхова абʼяднаць з Днём Дурня. У першага найвялікшы камэрцыйны патэнцыял, у другога – найбольшая колькасьць патэнцыйных удзельнікаў. Ну, міжнародны камсамольскі набор, накшталт 8 Сакавіка, ён і ў Афрыцы міжнародны. А ёсьць і непаўторная спэцыфіка, тыпу Дзень Дзякаваньня. У Беларусі такога дня няма, ну бо за што дзякаваць беларусу, хіба за тое што не нарадзіўся амэрыканцам? Мала яшчэ такіх беларусаў, якія гатовыя сьвяткаваць гэткі дзень. Таму пакуль што Дзень Дзякаваньня застанецца ў Беларусі будзённым днём. Шкада, бо дзякаваць беларусам сапраўды ёсьць за што.

Віталь ВОРАНАЎ

Беларускія майкі ў Паўночнай Амэрыцы

Майкі (T-shirts) зь беларускім арнамэнтам цяпер можна замовіць з Таронта! Белы і чырвоны колеры. Машынная вышыўка. Апрача маек, можна набыць асобна ўстаўку з арнамэнтам – для тых, хто хоча пашыць сабе беларускую кашулю самастойна.

Усе дэталі глядзіце на ўэб-сайце: ***http://igorfil.com***

Уплаты ў Згуртаваньне Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíüí³:

А. Бабкоў 60
С. Гехт 60
Ю. Канапацкая 60
У. Панасік 60
А. Чэкатоўскі 60
Г. Шаўчэнка 60
Х. Штымак 60
Я. Яджак 60

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:
P. O. Box 572
New York, NY 10113
Чэкі выпісвайце на імя
Viktar Yedzinovich.

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

адбудзецца ў суботу **17-га кастрычніка 2015 года** на Мангэтане ў Доме Маракоў па адрасу:

Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

Даезд цягнікамі падземкі ***L, N, Q, R, W, 4, 5, 6*** *да прыпынка* ***Union Square****.*

Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад ***Union Square*** *па* ***15-й вуліцы*** *на скрыжаваньні з* ***Irving Place****.*

Заля сходаў на 2-м паверсе.

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

А. Бабкоў 30
С. Гехт 30
В. Кавалёва 30
Ю. Канапацкая 30
А. Курушка 30
У. Панасік 30
А. Чэкатоўскі 30
Х. Штымак 30
Я. Яджак 30

Шчыры дзякуй!

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*

Marat Klakotski
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

Чэкі выпісвайце на імя скарбніка “Пагоні” ***Viktar Yedzinovich****.*

Электронны варыянт бюлетэня можна знайсьці ў інтэрнэце на сайце ***e-krama.com***